Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

26 САКАВІКА 2019 г. АЎТОРАК № 56 (28923)

ТОЛЬКІ Ў «ЗВЯЗДЗЕ»:
важны дзяржаўны дакумент – Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь — на беларускай мове
5–8

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй РЫБАК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі:

«Пералік парушэнняў Правілаў дарожнага руху, якія могуць фіксавацца камерамі, прапануецца пашырыць. Як вядома, цяпер камеры фіксуюць толькі парушэнні скараснага рэжыму і правілаў спынення і стаянкі. Разам з тым можна было б адсочваць і праезд на чырвонае святло, перасячэнне двайной суцэльнай разметкі або чыгуначнага пераезда — усё тое, што нясе павышаную рызыку для бяспекі дарожнага руху. Законапраект аб дарожным руху змяшчае і іншыя навацыі, у іх ліку сістэму налічэння балаў за парушэнні ПДР. Акрамя таго, прапануецца даць кандыдатам у кіроўцы права здаваць экзамен у ДАІ на машыне з аўтаматычнай каробкай перадач пасля праходжання адпаведнай падрыхтоўкі».

ПРАПАНОЎВАЦЬ НОВЫЯ НАПРАМКІ, НЕ СТАЯЦЬ НА МЕСЦЫ

Фота БелТА.

Такі лейтматыў камандзіроўкі Прэзідэнта на Магілёўшчыну

Апошні тыдзень сакавіка Аляксандр Лукашэнка пачаў з рабочай паездкі ў Магілёўскую вобласць. Тут Прэзідэнт наведаў сельскагаспадарчае прадпрыемства «Газавік-Сіпакова» ў аграгарадку Дабрэйка.

Прадпрыемства — паспяховае, рэгіён — адстае

«Газавік-Сіпакова» — філіял РУП «Магілёўаблгаз». Агульная плошча сельгасугоддзяў складае амаль 6 тысяч гектараў, у тым ліку ворных — 4,7 тысячы гектараў. На прадпрыемстве працуюць каля 240 чалавек.

У гаспадаркі даволі нядрэнныя паказчыкі: тэмп росту аб'ёму вытворчасці валавой прадукцыі за студзень — люты 2019 года склаў 103 % да аналагічнага перыяду мінулага года.

СТАР. 2

УЛАДАРЫ СЯЎБЫ

У Навагрудскім раёне першымі пачалі веснавую сяўбу ў сельгаспрадпрыемстве «ААТ «Прынёманскі». Сярод удзельнікаў адказнай кампаніі гаспадаркі — механізатары Андрэй КАЗЫРА і Уладзімір КУЗЬМІЧ — вопытныя, умелыя, з багатым стажам працы, кіроўцы. На энерганасычаных трактарах К-700 яны вядуць перадпасяўную апрацоўку глебы. Днямі мне давялося ўбачыць, як працуюць хлебаробы на палетках «Прынёманскага» і зрабіць фотарэпартаж, які змешчаны на нашым сайце zviazda.by.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Спецыяльны рэпартаж

ТРЫ МЕСЯЦЫ ДЭКРЭТУ І СУСТРЭЧЫ ПА РАСКЛАДЗЕ

Як у калоніі жывуць мамы з дзецьмі

«Калі чакаеш нараджэння дзіцяці, не звяртаеш увагі на рэжым, не так напружвае гэта абстаноўка. Я сябе суцяшаю тым, што часова жыву ў жаночым інтэрнаце», — расказвае адна з мам, якая адбывае пакаранне ў гомельскай папраўчай калоніі № 4. Яна прыціскае да сябе немаўля і ўдыхае яго малочны водар — праз пару гадзін малога трэба будзе зноў здаць на пост.

У чацвёртай калоніі працуе адзіны ў сістэме МУС Дом дзіцяці. Карэспандэнты «Звязды» з'ездзілі туды, каб паглядзець, як жывуць малыя, чые мамы аказаліся за кратамі. І даведацца, як гэта — бачыцца з дзецьмі па раскладзе.

СТАР. 4

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

КАРОТКА

• 977,6 рубля — сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі за люты гэтага года.

• У Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень» плануюць пабудаваць яшчэ адзін бізнес-цэнтр.

• Навучальны цэнтр у Печах 19 сакавіка самавольна пакінуў салдат. Хлопец уцёк без зброі.

• Трое мужчын скралі з банкаматаў у Мінску больш за Br200 тыс.

ISSN 1990 - 763X

ПРАПАНОЎВАЦЬ НОВЫЯ НАПРАМКІ, НЕ СТАЯЦЬ НА МЕСЦЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аб'ёмы жывёла- і птушкагадоўлі павялічыліся на 9,5 %, рэалізацыі гэтай прадукцыі — у 1,5 раза. Валавы надой малака ў 2018 годзе склаў 11 467 тон.

Безумоўна, акрамя вынікаў работы прадпрыемства, кіраўніку дзяржавы далажылі аб сацыяльна-эканамічным развіцці вобласці і Шклоўскага раёна, падрыхтоўцы тэхнікі, машын і абсталявання да веснавых палявых работ.

Асобна Прэзідэнт пацікавіўся спецыялізацыяй прадпрыемства, а таксама яго перспектывамі. Адказваў на пытанні беларускага лідара дырэктар «Газавік-Сіпакова» Вадзім Гарбіна.

Паводле яго слоў, цяпер яны займаюцца вытворчасцю малака і мяса, але ў будучыні гэтыя напрамкі пашыраць. Праз некалькі гадоў плануюць вырабляць рапсавы алей, зараз рапс толькі вырошчваюць і прадаюць.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, прадпрыемства працуе добра, але стаяць на месцы не варта. Ён падкрэсліў, што кожнай гаспадарцы патрэбна іскрынка, па-старому працаваць нельга. Пры гэтым трэба не толькі генераваць новыя ідэі, але і ствараць новыя напрамкі развіцця.

Важна вырабляць і вырошчваць тое, што запатрабавана, што прадаецца на рынку. Калі гэта брусніцы або грыбы — трэба звярнуць увагу на такія папулярныя пазіцыі.

Паспяховым гаспадаркам трэба працаваць не толькі па стандартных, прапрацаваных кірунках. Калі ёсць якасная база, можна і трэба заняцца развіццём «свежага». «Усё, традыцыйна працаваць забыліся — гэта павінна працаваць аўтаматам. Трэба ствараць новае», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Пагаварылі і пра тое, як ідуць справы ў іншых сельгаспрадпрыемствах рэгіёна. На жаль, тут не ўсё так добра, як у «Газавік-Сіпакова»: Прэзідэнт незадаволены развіццём сельскай гаспадаркі ў Магілёўскай вобласці і паабяцаў прыняць жорсткія меры.

Чакаем кадравых перастановак?

І гэта не проста здагадкі — непасрэдна падчас наведвання прадпрыемства кіраўнік дзяржавы даручыў Адміністрацыі Прэзідэнта ўнесці прапановы па кандыдатурах на пасаду свайго памочніка па Магілёўскай вобласці і віцэ-прэм'ера.

«Цэлы віцэ-прэм'ер, які загадвае сельскай гаспадаркай, курыруе Магілёўскую вобласць, упаўнаважаны Прэзідэнта. Памочнік Прэзідэнта зубы праеў на сельскай гаспадарцы і Магілёўскай вобласці. Губернатар самы прасунуты. І вы займаеце апошняе месца. Якую я з гэтага павінен рабіць выснову?» — пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка ў прысутных.

Ён нагадаў, што займацца гэтым пытаннем было даручана і губернатару Магілёўскай вобласці Уладзіміру Даманеўскаму.

Звяртаючыся да кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлі Качанавай, беларускі лідар даў тыдзень на ўнясенне прапаноў.

Такім чынам, у найбліжэйшы час пасады могуць страціць Міхаіл Русы і Генадзь Лаўранкоў. Па словах кіраўніка дзяржавы, на працягу года ў іх быў час змяніць сітуацыю ў сельскай гаспадарцы ў Магілёўскай вобласці, аднак выніку няма.

Далей Аляксандр Лукашэнка агледзеў, як гатова тэхніка да палявых работ, пагутарыў з супрацоўнікамі прадпрыемства і наведаў рамонтныя цэхі.

Прыйшоў, убачыў і зрабіў

Як толькі кіраўнік дзяржавы пакінуў прадпрыемства, журналісты пачалі даймаць пытаннямі яго дырэктара — Вадзіма Гарбіну. Яшчэ б — чалавеку ўсяго 35 гадоў, а ён паспяхова кіруе гаспадаркай, якую Прэзідэнт прыводзіць у прыклад.

«Першае — мы будзем пераходзіць на інтэнсіўны шлях вытворчасці малака. Будзем займацца племянной жывёлагадоўляй, — расказаў аб перспектыўных напрамках Вадзім Гарбіна. — Для гэтага будуем цэх раздою на 320 галоў, што дасць нам нармальна раздаіць пяршачку, гэтым мы ўжо падымем малако».

Акрамя таго, на прадпрыемстве займаюцца новымі культурамі ў раслінаводстве, аналізуюць высокапрадукцыйныя, высокаўраджайныя і высокабялковыя віды. «Як сказаў Прэзідэнт, трэба нешта новае знайсці. Мы будзем займацца і знойдзем. Адна з асноўных ідэй — вырошчванне і продаж цялушак. Гэта адзін з самых выгадных кірункаў. Пасля таго як увядзём цэх раздою, мы будзем займацца вырошчваннем цялушак», — дадаў ён.

У гаспадарцы вельмі нядрэнная сярэдняя зарплата — амаль 900 рублёў, ёсць сацыяльны пакет. Кіраўнік дзяржавы палічыў такі ўзровень зарплаты добрым для вёскі. У чым сакрэт поспеху? Вадзім Гарбіна расказаў, што першапачаткова, пры аб'яднанні гаспадарак, Магілёўаблгаз уклаў у прадпрыемства сродкі. Аднак, падкрэсліў дырэктар, з кожным годам уліванні гэтай арганізацыі ў яго гаспадарку скарачаюцца, а выручка — падымаецца.

«Газавік-Сіпакова» плануе выйсці на самафінансаванне. Дарэчы, вопыт замацавання гаспадарак за буйнымі прадпрыемствамі папрасіў вывучыць Прэзідэнт, паколькі, па яго словах, «будзе складана без прамысловасці выцягнуць сельскую гаспадарку».

Акрамя таго, на «Газавіку-Сіпакова» пастаянна кантактуюць з навукоўцамі, перайманюць тэхналогіі і вопыт — нават іншых краін. Толькі такі шлях дае плён.

«Калі будзем на месцы стаяць — гэта ўсё, — сказаў кіраўнік гаспадаркі. — Усе нашы супрацоўнікі гатовыя развівацца, тым больш трэба зарабіць грошы — проста так не плацім».

Прагучала пытанне з нагоды масавай сяўбы. «Не, мы яшчэ не пачыналі. Чакаем надвор'я. Якія прагнозы ў гэтым годзе на ўраджайнасць збожжавых? Пакуль сказаць цяжка, снегу ў нас было шмат. Я думаю, усё пойдзе, угнаенні, сродкі і паліва ёсць. Думаю, возьмем больш чым 50 цэнтнераў з гектара. 70? Мы плануем атрымаць 70», — пацвердзіў Вадзім Гарбіна.

А што там з пасяўной?

Прысутнічаў на прадпрыемстве і міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід Заяц. Ён расказаў журналістам, што ў бягучым годзе стаіць задача павялічыць аб'ём вытворчасці прадукцыі раслінаводства не менш чым у 1,2 раза. Пры гэтым ранняя вясна патрабуе вельмі высокай мабілізацыі і арганізаванасці для таго, каб правесці ў аператыўныя тэрміны сяўбу ранніх збожжавых яравых культур, правесці догляд азімых яравых культур.

«На сённяшні дзень практычна ва ўсіх рэгіёнах ідуць работы. Больш актыўна — гэта паўднёвая частка тэрыторыі нашай краіны, у Брэсцкай вобласці практычна сёння ўжо будзе пасеяна палова ўсіх збожжавых яравых. Да 30 працэнтаў наблізіцца Гомельская вобласць, да гэтай жа рысы падыдзе і Гродзенская вобласць з-за пэўных прыродна-кліматычных умоў і геаграфічнага размяшчэння. Натуральна, больш павольна ідзе праца ў Віцебскай і Магілёўскай абласцях. Тут яшчэ не пачалася вегетацыя азімых збожжавых культур, рапсу ў той момант, калі ў паўднёвай частцы завершыцца іх падкормка. Таму тэхнічна рэспубліка гатова», — адзначыў ён.

Такім чынам, у гатоўнасці знаходзіцца сельскагаспадарчая тэхніка, энерганасычаныя машыны, прычапная тэхніка, ёсць запчасткі і сэрвісныя цэнтры, каб у максімальна сцісłыя тэрміны правесці комплекс вясенне-палявых работ, накіраваных на захаванне ўраджаю азімых збожжавых і фарміраванне яравых збожжавых. Створаны штаб у Міністэрстве, рэгулярна будуць праводзіцца нарады з абласцямі.

Акрамя таго, па словах Леаніда Зайца, стан азімых збожжавых культур сёлета досыць нядрэнны. Па асобных палях ёсць снежная цвіль, але гэта адзінкавыя плошчы, таму баяцца няма чаго. Тым больш што за такімі землямі ўважліва сочаць спецыялісты і навуковыя супрацоўнікі, каб своечасова ўзмацніць падкормку або перасеяць.

«У гэтым годзе мы павінны атрымаць не менш як 8,5 мільёна тон збожжа ў свірнавай вазе, не менш за 700 тысяч тон рапсу, 5 мільёнаў тон цукровых буракоў, 180 тысяч тон ільнотрасты — гэта ў дастатку забяспечыць нашу жывёлагадоўлю травяністымі кармамі», — сказаў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання.

Раннюю вясну Леанід Заяц назваў плюсам для аграрыяў: клімат мяняецца, трэба быць да гэтага гатовым і перабудоўваць сістэму. Дарэчы, кіраўнік дзяржавы арыентуе аграрыяў на нетрадыцыйныя для нашай краіны культуры, на тыя, якія маглі б прыносіць нядрэнны прыбытак для гаспадарак у паўднёвай і цэнтральнай частках Беларусі. Гэта, напрыклад, вытворчасць кавуноў, вінаграду. Галоўнае, каб быў станоўчы вынік.

«Няма такіх пасяўных кампаній, якія былі б лёгкімі. Краіна ў гэтым годзе дастаткова арганізавана падышла да правядзення веснавой пасяўной кампаніі», — рэзюмаваў міністр.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

Парламенцкая дыпламатыя

Інфармацыя з першакрыніц

У Палаце прадстаўнікоў адбылася сустрэча з дэлегацыяй вышэйшага заканадаўчага органа Нідэрландаў

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах Валерый Варанецкі адзначыў, што гэта першы візіт парламенцкай дэлегацыі Каралеўства Нідэрландаў у Беларусь і ўжо таму ён значны.

— Думаю, што ў нашых адносінах назбіралася шмат пазітыву, ёсць, канешне ж, і крытычныя ноткі, але гэта нармальна. Вельмі важна часцей сустракацца, размаўляць, абменьвацца меркаваннямі, і ўзаемаразуменне будзе расці. У гэтым ключы мы расцэньваем ваш візіт, — звярнуўся ён да замежных калег.

У склад нідэрландскай дэлегацыі ўвайшлі члены парламенцкага камітэта па міжнародных справах, якія адначасова з'яўляюцца членамі камітэта па знешнім гандлі. Кіраўнік дэлегацыі — дэпутат парламента Каралеўства Нідэрландаў Раймон дэ Роон — узначальвае камітэт па знешнім гандлі.

У размове з нідэрландскімі парламентарыямі Валерый Варанецкі адзначыў, што апошнім часам двухбаковы палітычны дыялог паміж дзвюма краінамі пазітыўна развіваецца, як і эканамічныя стасункі, якія традыцыйна з'яўляюцца найбольш актыўным напрамкам двухбаковых адносін. Летась тавараабарот паміж краінамі наблізіўся да двух мільярдаў долараў.

Старшыня профільнай камісіі беларускага парламента выказаў спадзяванне на яшчэ больш актыўнае эканамічнае ўзаемадзеянне, у першую чаргу праз інвестыцыйнае супрацоўніцтва. Ён прапанаваў праводзіць бізнес-форумы, арганізаваць маштабны візіт дзелавых колаў Нідэрландаў у Беларусь.

Раймон дэ Роон пагадзіўся з тым, што роля парламенцкай дыпламатыі ў наш час узрастае і што палітыкам, дэпутатам інфармацыю пра іншую краіну лепш атрымліваць не толькі праз СМІ, інтэрнэт і ўрадавыя крыніцы, але і непасрэдна, праз візіты ў гэту краіну і асабістыя кантакты. Ён таксама запрасіў беларускіх калег наведаць Нідэрланды.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Будзь у курсе!

ДЛЯ БАЛЕЛЬШЧЫКАЎ — КАМФОРТ АД БЧ

Для дастаўкі ўдзельнікаў і балельшчыкаў II Еўрапейскіх гульняў ад Мінскага чыгуначнага вакзала да месцаў правядзення спартыўных мерапрыемстваў — «Мінск-Арэны» і вяслярнага канала ў Заслаўі — магістраль распрацавала расклад руху цягнікоў гарадскіх і рэгіянальных ліній эканомкласа на ўчастку Мінск — Масюкоўшчына — Беларусь. Ён зроблены з улікам графіка спартыўных мерапрыемстваў і ўзгоднены з Дырэкцыяй II Еўрапейскіх гульняў і ДУ «Сталічны транспарт і сувязь».

Як паведамілі ў прэс-цэнтры БЧ, з 22 да 30 чэрвеня для праезду балельшчыкаў і гледачоў да спартыўных арэн на ўчастку Мінск — Масюкоўшчына («Мінск-Арэна») — Беларусь (Заслаўе) штодня прадугледжана курсіраванне 57 цягнікоў, у тым ліку 32 цягнікоў гарадскіх ліній і 25 цягнікоў рэгіянальных ліній эканомкласа. У адваротным напрамку на Мінскі чыгуначны вакзал жыхароў і гасцей сталіцы будуць дастаўляць 62 цягнікі (38 цягнікоў гарадскіх ліній і 24 цягнікі рэгіянальных ліній эканомкласа).

Таксама сумесна з Беларускай асацыяцыяй экспертаў і сюрвееру на транспарце праведзена абследаванне сістэм арыентавання і інфармавання для пасажыраў на станцыях Мінск-Пасажырскі і Беларусь, а таксама прыпыначных пунктах Масюкоўшчына і Мінск-Паўночны. Для спрашчэння арыентавання пасажыраў на аб'ектах чыгуначнага транспарту праведзена дапрацоўка сістэм інфармавання як у частцы зместу, так і іх размяшчэння.

Акрамя таго, праводзіцца комплекс мерапрыемстваў па развіцці інфраструктуры станцыі Мінск-Пасажырскі. Для стварэння камфортных і бяспечных умоў знаходжання пасажыраў на Мінскім чыгуначным вакзале заменены шэсць эскалатараў, устаноўлена сістэма відэаназірання на платформе № 6 і каля пуці № 17, завершаны работы па ўладкаванні сістэмы кандыцыянавання паветра ў касавых залах, а таксама рамонце мужчынскіх санітарных вузлоў.

Асаблівая ўвага аддаецца камунікатыўнай падрыхтоўцы персаналу для стасункаў з прадстаўнікамі розных нацыянальных культур. На курсах англійскай мовы прайшлі навучанне ўжо 99 работнікаў магістралі. Гэта дыктары, білетныя касіры, работнікі залаў чакання павышанай камфортнасці, кантакт-цэнтра і цягніковыя брыгады. У мэтах удасканалення якасці абслугоўвання пасажыраў на вакзалах і ў цягніках для персаналу выраблена неабходная колькасць спецыялізаваных руска-англійскіх размоўнікаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Па палічках

Пенсіі, дапамогі, лісткі непрацаздольнасці...

Усё гэта выплачваецца са сродкаў ФСАН

Практычна ўсе мы ў розныя перыяды свайго жыцця і ў залежнасці ад абставін аказваемся як плацельшчыкамі ўзносаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН) — калі працуем, так і атрымальнікамі сродкаў з яго — калі становімся непрацаздольнымі. Ад выплаты ўзносаў у ФСАН залежаць правы мільёнаў людзей на будучую пенсію і шэраг дзяржаўных дапамог.
Аб паступленнях сродкаў у фонд і яго выдатках расказвае кіраўнік Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Наталля Паўлючэнка.

Як фарміруецца бюджэт фонду

Асноўную крыніцу бюджэту — больш за 90 % — складаюць абавязковыя страхавыя ўзносы ад работадаўцаў. Пры гэтым памер страхавых узносаў у фонд раўняецца 35 %. З іх 34 % выплачвае работадаўца (з гэтых 34 працэнтаў 28 % ідуць на пенсійнае страхаванне за работнікаў і 6 % — на сацыяльнае страхаванне). І 1 % утрымліваецца з зарплаты работнікаў — на пенсійнае страхаванне.

Больш за 77 % выдаткаў ФСАН накіравана на выплату пенсій. Гэта 10,5 млрд рублёў, з якіх 10,2 млрд рублёў накіравана на выплату працоўных пенсій.

Некаторыя фізічныя асобы самастойна выплачваюць страхавыя ўзносы са свайго даходу (калі ён не ніжэй за мінімальную зарплату), адзначыла Наталля Паўлючэнка. Гэта датычыцца індывідуальных прадпрымальнікаў, натарыусаў, адвакатаў, самазанятых і некаторых іншых катэгорый. Памер страхавых узносаў для гэтай катэгорыі плацельшчыкаў складае 35 % (29 % на пенсійнае страхаванне і 6 % — на сацыяльнае).

На ўлік ў ФСАН на пачатак бягучага года стаяла амаль 585 тысяч плацельшчыкаў. З іх 250 тысяч складалі работадаўцы, юрыдычныя асобы, 330 тысяч — індывідуальныя прадпрымальнікі, а таксама 2259 адвакатаў, 859 натарыусаў і больш за тысячу іншых фізічных асоб.

Аб даходах ФСАН...

Паступленні ў бюджэт Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва ў 2018 годзе, паводле папярэдніх звестак, склалі 13,9 млрд рублёў і павялічыліся ў параўнанні з мінулым годам на 17,4 %.

Ад работадаўцаў паступіла 12,7 млрд рублёў. Рост у адносінах да мінулага года склаў 17,4 %. Каля 115,5 млн рублёў — гэта ўзносы на прафесійнае пенсійнае страхаванне.

Ад ІП, адвакатаў, натарыусаў і іншых катэгорый фізічных асоб, якія самастойна аплачваюць унёскі, паступіла 124,4 млн рублёў, або менш за 1 % ад агульнай сумы. Таксама ў даходы ФСАН паступілі непадатковыя паступленні ў памеры каля 207,8 млн рублёў.

Таксама ў даходную частку бюджэту ўваходзіць трансферт з рэспубліканскага бюджэту на кампенсацыю нестрахавых выдаткаў, г. зн. расходаў, фінансаванне якіх прадугледжана з рэспубліканскага бюджэту. Маюцца на ўвазе, напрыклад, сацыяльныя пенсіі асобам, якія не выпрацавалі страхавы стаж, і, адпаведна, іх выплаты не абумоўлены дзяржаўным сацыяльным страхаваннем, а таксама некаторыя дапамогі, якія выплачваюцца з рэспубліканскага бюджэту. За мінулы год трансферт з рэспубліканскага бюджэту на кампенсацыю нестрахавых выдаткаў склаў 810,5 млн рублёў.

...і аб выдатках

Што да выдаткаў ФСАН, то больш за 77 % іх накіравана на выплату пенсій (гэта 10,5 млрд рублёў, з якіх 10,2 млрд рублёў накіравана на выплату працоўных пенсій).

Больш за 21 % выдаткаў ідзе на выплату дапамог (або 2,9 млрд рублёў). Каля 44 % усіх выдаткаў на дапамогі, або 1,3 млрд рублёў, складаюць выдаткі на дапамогі па доглядзе дзіцяці да трох гадоў.

На дапамогі па часовай непрацаздольнасці ідзе 23 % усіх выдаткаў на дапамогі, або больш 656 млн рублёў. За год аплачваецца каля 3,4 млн лісткоў непрацаздольнасці.

Астатнія пункты выдаткаў — гэта аднаразовыя дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці, дапамогі на дзяцей старэйшых за тры гады і некаторыя іншыя. Таксама расходы датычацца мерапрыемстваў па забеспячэнні занятасці, санаторна-курортнага лячэння і іншых.

У цэлым, па словах Наталлі Паўлючэнкі, паводле папярэдніх вынікаў за мінулы год, бюджэт фонду выкананы з прафіцытам у суме 314,9 млн рублёў. Міжбюджэтны трансферт для збалансаванасці бюджэту фонду на выплату працоўных пенсій і дапамог летась не прыцягваўся.

Святлана БУСЬКО.

❍ ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Летась толькі Мінск змог цалкам забяспечыць выплату пенсій і дапамог сродкамі, якія паступаюць у ФСАН. Забяспечанасць імі ў сталіцы склала крыху больш за 151 %. Усе астатнія рэгіёны краіны былі датацыйнымі. Найменшая забяспечанасць ФСАН уласнымі сродкамі была ў Магілёўскай вобласці — 67,1 %, потым ідзе Віцебская вобласць — 69,2 %, далей Брэсцкая — 73,1 %. Амаль забяспечана ўласнымі сродкамі для выплаты пенсій і дапамог Мінская вобласць — 98,6 %. Калі разглядаць у разрэзе раёнаў, то забяспечанымі з'яўляюцца толькі 25 раёнаў, з якіх восем раёнаў Мінска.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Мільён брытанцаў выйшлі на марш у Лондане за новы рэферэндум па брэксіце

Брытанцы выйшлі на вуліцы Лондана, патрабуючы правесці новы рэферэндум па пытанні аб выхадзе Вялікабрытаніі з Еўрасаюза. Па словах арганізатараў, колькасць удзельнікаў маршу дайшла да мільёна, што перасягнула ўсе чаканні, паведаміла The Guardian. Такім чынам, пратэст стаў адным з самых масавых у гісторыі каралеўства. У акцыі ўзяў удзел і мэр Лондан Садзік Хан. Ён адзначыў у сваім «Твітэры», што, незалежна ад таго, як галасавалі брытанцы ў 2016 годзе, яны не аддавалі свае галасы за дрэнную здзелку з ЕС або за выхад з Еўрасаюза зусім без здзелкі. Хан заўважыў, што нерашучасць прэм'ер-міністра ўжо павярнулася супраць брытанцаў: аб'ём інвестыцый у краіну зніжаецца і «амаль кожны тыдзень» той ці іншы буйны вытворца заяўляе аб згортванні вытворчасці ў Вялікабрытаніі. Як вядома, анлайн-петыцыя да парламента з патрабаваннем адмяніць брэксіт набрала больш за 4 мільёны подпісаў.

Прэзідэнт Малі адправіў у адстаўку кіраўніка генштаба пасля гібелі 134 чалавек

Прэзідэнт Малі Ібрагім Бубакар Кейта прыняў рашэнне адправіць у адстаўку кіраўніка генштаба Мбембу Мусу Кейта, паведамляецца ў заяве савета міністраў краіны. Як вядома, па меншай меры 134 чалавекі загінулі ў выніку нападу ў вобласці Мопці ў цэнтральным Малі. Па наяўнай інфармацыі, узброеныя людзі атакавалі пастухоў народа фулані ў населішчах Агасагу і Велінгара. Сярод загінулых аказаліся дзеці, цяжарныя жанчыны і пажылыя людзі. Шматпрофільная комплексная місія ААН па стабілізацыі ў Малі накіравала сілы хуткага рэагавання ў населеныя пункты, на якія быў здзейснены ўзброены напад. Некалькі дзён таму ў гэтым жа рэгіёне звыш 20 малійскіх ваеннаслужачых загінулі ў выніку атакі джыхадыстаў.

Гарачы чай павышае рызыку развіцця раку стрававода на 90 працэнтаў

Занадта гарачы чай павышае рызыку развіцця раку стрававода амаль удвая, высветлілі анколагі з Тэгеранскага універсітэта медыцынскіх навук. Пра вынікі даследавання яны расказалі ў часопісе International Journal of Cancer. На працягу дзесяці гадоў даследчыкі назіралі за групай з 50 тысяч чалавек на паўночным усходзе Ірана. Рызыка ўзнікнення раку павышаецца з-за таго, што занадта гарачы чай пашкоджвае слізістую стрававода, прыводзячы да яе запалення, лічаць аўтары маштабнага даследавання. Таксама яны дапускаюць, што парушэнне бар'ернай функцыі прыводзіць да больш выяўленага ўздзеяння магчымых канцэрагенаў. «Варта пачакаць, пакуль гарачыя напоі астынуць, перш чым іх піць», — раіць анколаг Фархад Ісламі, вядучы аўтар даследавання.

Надвор'е

ЯШЧЭ НЕ МАЙ МЕСЯЦ

У чацвер пры праясненнях — да мінус 7 градусаў

На гэтым тыдні ў нашай краіне чакаецца кароткачасовае пахаладанне. Месцамі будзе ісці мокры снег, прагназуецца галалёдзіца і парывісты вецер. Характэрнай асаблівасцю сакавіцкага надвор'я з'яўляецца яго зменлівасць. Гэты год не стаў выключэннем, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ўдзень праз нашу тэрыторыю перамесціцца атмасферны фронт, услед за якім пачне распаўсюджвацца больш халаднаватае паветра. Удзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу. Вецер прагназуецца заходні, паўночна-заходні ўмераны, удзень месцамі парывісты. Максімальная тэмпература паветра складзе 2—8 цяпла. У сераду ўмовы надвор'я ўначы будзе вызначаць халодная няўстойлівая паветраная маса, а ў дзённыя гадзіны адаб'ецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску. Чакаецца пераменная воблачнасць. Уначы месцамі пройдзе кароткачасовы снег, удзень будзе пераважна без ападкаў, на асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер паўночна-заходні парывісты, тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 6 градусаў, удзень — 1—7 цяпла.

Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

У чацвер у асноўным захаваецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы па поўначы месцамі магчымы невялікі кароткачасовы снег. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 5 градусаў, пры працяглых праясненнях — да 7 марозу. Удзень будзе ад плюс 5 да плюс 10 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу ў большасці рэгіёнаў на надвор'е будзе ўплываць павышаны атмасферны ціск. Ападкаў не чакаецца, толькі ўначы па паўночнай частцы краіны, дзе адаб'ецца ўплыў малаактыўнага франтальнага раздзела, месцамі пройдуць мокры снег і дождж. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, удзень — ад плюс 6 градусаў па паўночным усходзе да 13 цяпла па паўднёвым захадзе краіны. У найбліжэйшыя выхадныя цёплае паветра пачне паступаць з Заходняй Еўропы, таму да нас вернецца мяккая вясна.

Сяргей КУРКАЧ.

Два агенцтвы нерухомасці закрываюцца 29 сакавіка

Міністэрства юстыцыі пазбавіла ліцэнзій агенцтвы «Планета нерухомасці» і «Нью Флэт», якія неаднаразова парушалі заканадаўчыя патрабаванні да рыэлтарскай дзейнасці. Летась абедзвюм арганізацыям выносіліся прадпісанні за парушэнні пры рэкламаванні аб'ектаў і аказанні паслуг, а работнікаў штрафавалі.

Апошняй кропляй у рабоце агенцтва «Планета нерухомасці» стала скарга грамадзяніна Е. Ён звярнуўся ў арганізацыю праз рэкламу кватэры, якая здавалася ўнаём. Мала таго што рэклама аказалася недакладнай, дык яшчэ і па ўказаным адрасе замест жылога будынка знаходзіўся адміністрацыйны. Акрамя таго, рыэлтарскія паслугі спажыўцу аказвала асоба, якая не працавала ў штаце агенцтва.

Як нагадалі ў Мінюсце, рыэлтарскія паслугі маюць права аказваць толькі асоба, якая працуе ў штаце арганізацыі, рыэлтар або агент па аперацыях з нерухомасцю.

— Падставай для закрыцця «Нью Флэт» стала неадпаведнасць дырэктара агенцтва пасадзе, якую ён займаў. Згодна з законам узначальваць рыэлтарскую арганізацыю можа асоба, якая мае пасведчанне аб атэстацыі рыэлтара або вышэйшую адукацыю ці стаж работы не менш як тры гады ў якасці кіраўніка рыэлтарскай арганізацыі, яе падраздзялення ці спецыяліста па рыэлтарскай дзейнасці. На пасадзе кіраўніка агенцтва знаходзіўся чалавек, які не адпавядаў гэтым патрабаванням.

Акрамя закрыцця агенцтваў, Мінюст прыпыніў дзейнасць картак двух спецыялістаў па рыэлтарскай дзейнасці: гэта Жаркевіч В. П. (да 18 сакавіка 2021 года) і Процка В. Л. (да 18 сакавіка 2020-га). У канцы 2017-га, дарэчы, дзеянне карткі Жаркевіч, на той момант агента па аперацыях з нерухомасцю агенцтва «Твая кватэра», ужо прыпынялі на год за тое, што жанчына давала спажыўцам недакладную інфармацыю пра кватэры для найму.

У Мінюсце папярэджваюць, што абодва спецыялісты могуць ізноў аказваць рыэлтарскія паслугі толькі пасля заканчэння тэрміну прыпынення дзейнасці іх картак. А спажыўцы, якія заключылі дагаворы з «Планетай нерухомасці» і «Нью Флэт», павінны звяртацца для іх скасавання ў гэтыя арганізацыі.

Ірына СІДАРОК.

ТРЫ МЕСЯЦЫ ДЭКРЭТУ І СУСТРЭЧЫ ПА РАСКЛАДЗЕ

Праз некалькі месяцаў Ірына расстанецца з дачкой. «Хачу, каб тры гады ёй споўнілася дома».

«БАЦЬКОЎСКІХ ПРАВОЎ ЖАНЧЫН НЕ ПАЗБАЎЛЯЮЦЬ»

Дом дзіцяці ўзнік у гомельскай калоніі яшчэ ў 1961 годзе. Побач з будынкам — пляцоўка з горкамі і арэлямі, персанал — жанчыны ў белых халатах. Падобна на звычайны дзіцячы садок — калі б не высокая агароджа з дротам і прапускная сістэма.

— Тут знаходзяцца малыя да трох гадоў. У такім узросце яны яшчэ не разумеюць, што жывуць у папраўчай установе, — кажа **начальнік Дома дзіцяці Марыя ЗАПАРОВАННАЯ.**

Па адукацыі яна ўрач. Раней працавала дзіцячым неўролагам, а шэсць гадоў таму перавялася на работу ў калонію. Спачатку ў медчасць, потым — да дзяцей.

За малечай тут наглядаюць кругласутачна: дзяжураць медсёстры і нянькі. У штаце ёсць таксама выхавацелі, педыятр, масажыстка, музычны кіраўнік, дэфектолаг. Марыя Запарованная сумна заўважае: некаторым дзецям пашанцавала, што яны апынуліся тут.

— Многія нараджаюцца з паталогіямі — з боку сардэчна-сасудзістай, стрававальнай, нервовай сістэмы. Па артапедыі шмат праблем. Не факт, што гэтыя дзеці своечасова трапілі б да ўрача: сярод мам ёсць тыя, хто вядзе асацыяльны лад жыцця. А тут мы можам пачаць лячэнне.

Два гады таму Дом дзіцяці адрамантавалі. У пакоях — новая мэбля, цацкі, развівальныя гульні. Для дзяўчатак стаяць куткі маленькай цырульніцы і кухара, для хлопчыкаў — пластмасавыя пазадарожнікі. У халадзільніку на кухні — слоічкі з фруктовым пюрэ.

— Пялёнак, памперсаў — усяго хапае, — запэўнівае начальнік установы. — Мы падаём гадавую заяўку, дзе ўказваем, колькі і чаго патрэбна. Плюс ёсць дапамога ад спонсараў і валанцёраў.

Па Крымінальна-выканаўчым кодэксе маці можа праводзіць з малым увесь вольны ад работы час. «Дэкрэт», падчас якога вызваляюць ад працы на швейнай фабрыцы, тут доўжыцца не тры гады, а тры месяцы. У тых, хто корміць грудным малаком, у пропуску дадаткова напісаны гадзіны кармлення.

— Немаўля ўзважваюць да і пасля яды, каб ведаць, ці сытае яно. Калі малака няма, цалкам пераводзім на сумесі.

— Іх таксама дае маці?

— Не, тады кормяць супрацоўнікі.

Што адбываецца з дзецьмі пасля трох гадоў? Калі іх не можа забраць бацька, аформіць апякунства прапануюць іншым сваякам. Калі гэта немагчыма, хлопчыкаў і дзяўчатак адпраўляюць у дзіцячы дом. Але апошнія два гады гэту стадыю стараюцца мінуць і адразу перадаць малога ў прыёмную сям'ю: там над ім афармляюць часовае апякунства, пакуль мама не вызваліцца.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У штаце Дома дзіцяці ёсць і выхавацелі, і медыкі.

— Бацькоўскіх правоў з-за таго, што жанчына знаходзіцца ў калоніі, не пазбаўляюць, на ўсынаўленне малых не аддаюць, — адзначае Марыя Запарованная. — Калі асуджанай хутка вызваляцца, а дзіцяці ўжо споўнілася тры гады, яна можа напісаць заяву, каб на некалькі месяцаў працягнуць знаходжанне тут сына ці дачкі. Як правіла, ідуць насустрач, каб не разлучаць сям'ю.

«МНОГІМ ПРАСЦЕЙ, КАЛІ ДЗЯЦЕЙ ДАГЛЯДАЕМ МЫ»

Жывуць мамы разам з астатнімі асуджанымі ў атрадзе, асобна ад дзяцей — незалежна ад таго, колькі малым гадоў (ці месяцаў). Прынамсі, да гэтага года іншага варыянта і не было. Цяпер ёсць — у студзені ў калоніі адкрылі інтэрнат для сумеснага пражывання мам з дзецьмі.

— Ён створаны, каб, па-першае, мінімальна траўміраваць дзіця, па-другое — прышчапіць жанчыне мацярынскія пачуцці. Не ва ўсіх гэты сын ці дачка доўгачаканыя, — тлумачаць тут. — Можа, мама — адзіночка і баіцца не справіцца з усімі праблемамі.

Падобныя інтэрнаты ёсць у ЗША, Канадзе, Швецыі, Даніі, Германіі. Узрост дзяцей, што жывуць у папраўчых установах разам з маці, — ад трох месяцаў да шасці гадоў. У беларускі інтэрнат пры калоніі жанчыны могуць засяліцца, калі малому споўніцца год. Да гэтага часу персанал назірае за асуджанай: ці не пачалася ў яе пасляродавая дэпрэсія, ці спраўляецца яна са сваімі мацярынскімі абавязкамі.

У інтэрнаце кожнай жанчыне з дзіцем выдзяляецца асобны пакой (для параўнання: у атрадзе зняволеныя жывуць у пакоі больш чым па дзесяць чалавек). Ёсць пакой для гульняў і кухня — з халадзільнікам, чайнікам. Ці вялікая чарга з ахвотных пераехаць сюды?

— На жаль, ахвотных нямнога. Вось такі парадокс, — здзіўляе начальнік Дома дзіцяці. — Пакояў 15, занятыя толькі два. Спачатку яшчэ пару жанчын хацелі засяліцца, але адмовіліся: не спраўляюцца. Напэўна, многім прасцей, калі дзяцей даглядаем мы, а яны рыхтуюць толькі пагуляць. На сумеснае пражыванне пераходзім паэтапна — начаваць жанчыны пакуль не застаюцца.

Ірына — адна з тых мам, што засяліліся ў інтэрнат. Толькі што вярнулася са спаткання з мужам. Яе дачка Улада на чужых у пакоі не звяртае ўвагі: распакоўвае ляльку, якую атрымала ў падарунак ад бабулі.

Арцёмка — трэцяе дзіця ў Таццяны.

У калонію Ірына трапіла праз наркотыкі. Дома ў яе знайшлі дзевяць грамаў асабліва небяспечнага псіхатропу. Далі дзевяць гадоў зняволення. Падрабязнасцяў жанчына пазбягае. «Я ж не на судзе, не хачу пра гэта расказваць».

Пра тое, што цяжарная, Ірына даведалася ў следчым ізалятары. Успамінае, што на пятым-шостым месяцы ёй назначылі дыету (дадаткова давалі малако, тварог) і некалькі гадзін пасцельнага рэжыму. Нараджаць жанчыну вазілі ў звычайную радзільню, у суправаджэнні канвою.

Улада — не першае яе дзіця. Дома маму чакаюць двайняты-другакласнікі. Цяпер іх даглядаюць муж і мама Ірыны.

— Бачуся з дзецьмі раз у 2,5—3 месяцы, па правілах часцей немагчыма. І то гэта я на палепшаных умовах, бо стаю на шляху выпраўлення: дагэтуль сустрэчы былі раз у чатыры месяцы.

З маленькай Уладай жанчына гуляе па графіку — з 15 да 17 і з 18 да 19 гадзін. «Вядома, хацелася б больш. Мы катаемся на арэлях, малюем, складаем пазлы. Дачка ў лато любіць гуляць».

Зараз дзяўчынцы крыху больш за два гады. Тры ёй споўніцца дома — яна паедзе туды літаральна праз пару месяцаў.

— Са снежня пойдзе ў садок — запісалі ўжо. Я такое рашэнне прыняла адразу. Мне здаецца, гэта разумна і нармальна. Розніца ў чым? Аддаць яе ў тры гады ці на пару месяцаў раней — мне аднолькава будзе цяжка. Але дом — гэта дом. Ужо рыхтуюць пакой для дачкі. Усё ў яе будзе.

«ПАСЛЯ КЕСАРАВА ВЫПІСАЛІ ПРАЗ ЧАТЫРЫ ДНІ»

Пасля заканчэння працоўнай змены на фабрыцы ў Доме дзіцяці становіцца ажыўлена. Жанчыны падыходзяць да акенца, каб атрымаць немаўля. Свайго Арцёмку бярэ і мама Таццяна.

— Якія мы прыбранькія! Кожны дзень мяняем гардэроб, — усміхаецца, аглядаючы сына.

Таццяна пры макіяжы — цені, туш, бляск для вуснаў. Кажа, што фарбуецца практычна кожны дзень.

❍ ДАВЕДКА

Цяпер у Доме дзіцяці жыве каля 30 хлопчыкаў і дзяўчатак. Узрост іх мам — ад 20 да 40 гадоў. Раней выхаванцаў у гэтай установе было больш: напрыклад, у канцы 1980-х — 82 дзіцяці, у 2000-м — 75.

«Любая жанчына хоча быць прыгожай, у якім бы месцы ні была».

Мама гушкае малога і расказвае, як апынулася тут. Спачатку атрымала два гады за наркотыкі — падсела на іх, пасля таго як пахавала мужа. Праз час замянілі пакаранне на больш мяккае і адправілі на дамашнюю «хімію». Заставалася дабыць 20 дзён, калі жанчыну за парушэнні рэжыму асудзілі яшчэ на год і тры месяцы.

Ад першага шлюбу ў Таццяны засталіся два сыны — 12 і 7 гадоў. Пра іх пакуль клапоціцца свякроў. Арцём — дзіця ад новага мужчыны.

— Цяжарнасць была незапланаваная. Доўга вырашала, ці захаваць яе, — прызнаецца жанчына. — Для майго мужчыны гэта першынец.

У радзільню Таццяну адвозілі на «хуткай» — пачалі адыходзіць воды. Экстранна зрабілі кесарава. Выпісалі праз чатыры дні. Арцёмка прыехаў да мамы пазней: перш чым адправіць немаўля ў калонію, яго абследуюць у бальніцы. Цяпер у мамы ёсць дазвол ад гінеколага на ціхую гадзіну — напрыклад, у будныя дні яна можа дадаткова адпачываць на спальным месцы з 10 да 12 гадзін.

— Вядома, цяжка дзяўчатам з вялікімі тэрмінамі, якія аддаюць дзіця дадому. Тут не бачыш сына пару гадзін — ужо здаецца, вечнасць прайшла... Самі вінаваты, з аднаго боку. Аступіліся — што цяпер зробіш, — разважае Таццяна. — Некаторыя кажуць: вой, дрэнна, што праз вокны калоніі горад відаць — па сэрцы рэжа. А мне лягчэй так. У «Алмі» ў думках хаджу *(смяецца)*.

Мама стараецца захоўваць аптымізм: маўляў, час пралятае незаўважна, калі ёсць аб кім клапаціцца. Выйдзе на фабрыку — дні пабягуць яшчэ хутчэй. Таццяна ўжо ўяўляе, як 28 снежня паедзе з падарункамі дадому.

— Першай справа — да мамы ў Нясвіж. Пасяджу ў дэкрэце, калі будзе магчымасць, пастараюся раней выйсці на работу, бабуля з дзіцем дапаможа. Праўда, у мяне спецыяльнасці няма, бухгалтарскія курсы толькі заканчвала.

Пра тое, што сёлета чакаецца амністыя, Таццяна чула. Але вялікіх надзей адносна сябе не мае. «415-ы — такі артыкул (ухіленне ад адбывання пакарання. — **Аўт.**)... Табе па сутнасці ўжо давалі шанц, а ты не скарыстаўся».

***

Не ўсе гісторыі — са шчаслівым канцом.

— На жаль, часам гады, праведзеныя дзіцем у калоніі, — найлепшыя ў яго жыцці, — уздыхае Марыя Запарованная. — Тут яно пад наглядам, накормленае, а дома... Ведаю, пра што кажу, бо праз паўгода пасля вызвалення жанчыны мы пасылаем запыт у органы апекі, каб даведацца, як у сям'і справы. І нярэдка малое трапляе ў дзіцячы дом, а маці пазбаўляюць бацькоўскіх правоў.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.
Мінск — Гомель — Мінск.

Меню дзецям складае медсястра-дыетолаг. Сёння на абед, напрыклад, боршч з мясам, каша грэцкая з маслам і суфле з адвараната кураняці.

Пастанова Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь № 1

АБ КАНЦЭПЦЫІ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ БЯСПЕКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Савет Бяспекі Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе**:

1. Зацвердзіць Канцэпцыю інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (дадаецца).

2. Дзяржаўным органам і іншым арганізацыям у практычнай дзейнасці кіравацца палажэннямі Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

3. Дзяржаўнаму сакратару Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь адлюстроўваць вынікі рэалізацыі Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь у штогадовым дакладзе Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь аб стане нацыянальнай бяспекі і мерах па яе ўмацаванні.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

18 сакавіка 2019 г., г. Мінск

КАНЦЭПЦЫЯ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ БЯСПЕКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова Савета Бяспекі
Рэспублікі Беларусь
18.03.2019 № 1

РАЗДЗЕЛ І
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

ГЛАВА 1
Сусветнае значэнне інфармацыйнай сферы

1. На цяперашнім этапе сусветнага развіцця інфармацыйная сфера набывае ключавое значэнне для сучаснага чалавека, грамадства, дзяржавы і аказвае ўсёабдымны ўплыў на эканамічныя, палітычныя і сацыяльныя працэсы, якія адбываюцца ў краінах і рэгіёнах. У выніку павышэння насычанасці і дынамікі грамадскіх адносін, сусветных і рэгіянальных падзей, росту ўсеагульнага інтэлектуальнага патэнцыялу значна павялічваюцца інфармацыйныя патрэбы людзей.

Інфармацыйнае грамадства, якое фарміруецца ў глабальным маштабе, уяўляе сабой новы этап развіцця цывілізацыі з перавагай ведаў і інфармацыі, уздзеяннем інфармацыйных тэхналогій на ўсе сферы чалавечай дзейнасці. Кардынальна павышаецца роля інфармацыйных тэхналогій у рэалізацыі праваў і свабод грамадзян.

Індустрыя тэлекамунікацыі стала адной з найбольш дынамічных і перспектыўных сфер сусветнай эканомікі. З працэсамі інфарматызацыі ўсё больш звязваюцца нацыянальныя эканамічныя інтарэсы і перспектывы інвестыцый.

2. Разам з тым трансфармацыя сацыуму ў інфармацыйнае грамадства спараджае новыя рызыкі, выклікі і пагрозы, якія наўпрост закранаюць пытанні забеспячэння нацыянальнай бяспекі, у тым ліку абароненасць інфармацыйнай прасторы, інфармацыйнай інфраструктуры, інфармацыйных сістэм і рэсурсаў.

ГЛАВА 2
Актуальнасць і значэнне Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь

3. Фарміраванне ў Рэспубліцы Беларусь інфармацыйнага грамадства, якое забяспечвае даступнасць інфармацыі, распаўсюджванне і выкарыстанне ведаў для паступальнага і прагрэсіўнага развіцця, разглядаецца як нацыянальны прыярытэт і агульнадзяржаўная задача.

4. Актуальнасць і значэнне Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (далей — Канцэпцыя) абумоўліваюцца наступнымі фактарамі:

павышэннем значнасці фарміравання інфармацыйнага грамадства ў Рэспубліцы Беларусь, яго ролі ў сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі як суверэннай і незалежнай дзяржавы, бяспекі рэалізацыі нацыянальных стратэгій і планаў стварэння лічбавай эканомікі і навукова-тэхнічнага прагрэсу ў цэлым;

неабходнасцю прадметнай і ўсебаковай ўсвядомленай абароны нацыянальных інтарэсаў у інфармацыйнай сферы, якія вызначаюцца Канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, абагульнення практычна і навукова абгрунтаваных поглядаў на забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі, канкрэтызацыі і дэталізацыі падыходаў да гэтай дзейнасці;

неабходнасцю разгляду інфармацыйнай бяспекі як адасобленага феномена і нарматыўнага інстытута, а таксама прававога замацавання асноў дзяржаўнай палітыкі па абароне нацыянальных інтарэсаў у інфармацыйнай сферы;

фарміраваннем новай сферы грамадскіх адносін па гарантаванні інфармацыйнай бяспекі;

важнасцю паляпшэння каардынацыі і кіравальнасці дзейнасці суб'ектаў, уцягнутых у развіццё інфармацыйнай сферы і забеспячэнне яе бяспекі, устойлівага і паслядоўнага функцыянавання механізмаў рэагавання на рызыкі, выклікі і пагрозы інфармацыйнай бяспецы;

неабходнасцю інфармавання грамадзян, а таксама міжнароднай супольнасці аб прынятых у Рэспубліцы Беларусь поглядах на сферу інфармацыйнай бяспекі і прыярытэтах яе забеспячэння;

інтэграцыяй Беларусі ў сістэму міжнароднай інфармацыйнай бяспекі, важнасцю павышэння канцэптуальнай і тэхналагічнай сумяшчальнасці і сінхранізацыі мэт і задач нацыянальнай сістэмы забеспячэння інфармацыйнай бяспекі з карэспандуючымі сістэмамі іншых дзяржаў і арганізацый.

ГЛАВА 3
Прадмет, мэта, задачы Канцэпцыі, яе сувязь з іншымі дактрынальнымі дакументамі

5. Канцэпцыя ўяўляе сабой сістэму афіцыйных поглядаў на сутнасць і змест забеспячэння нацыянальнай бяспекі ў інфармацыйнай сферы, вызначае стратэгічныя задачы і прыярытэты ў галіне забеспячэння інфармацыйнай бяспекі.

Канцэпцыя забяспечвае комплексны падыход да праблемы інфармацыйнай бяспекі, стварае метадалагічную аснову для ўдасканалення дзейнасці па яе ўмацаванні, служыць асновай для фарміравання дзяржаўнай палітыкі, выпрацоўкі мер па ўдасканаленні сістэмы забеспячэння інфармацыйнай бяспекі, канструктыўнага ўзаемадзеяння, кансалідацыі намаганняў і павышэння эфектыўнасці абароны нацыянальных інтарэсаў у інфармацыйнай сферы.

6. Канцэпцыя грунтуецца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, заканадаўстве Рэспублікі Беларусь у галінах нацыянальнай бяспекі, інфарматызацыі, развіцця лічбавай эканомікі, інфармацыйнага грамадства, навукі і тэхналогій, абароны інтэлектуальнай уласнасці, іншых актах заканадаўства.

Канцэпцыя грунтуецца на Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, а менавіта:

зыходзіць з разумення асноўных тэндэнцый сучаснага свету, вызначаных у ёй асноўных нацыянальных інтарэсаў у інфармацыйнай сферы, патэнцыйных альбо рэальна існуючых пагроз нацыянальнай бяспецы;

канкрэтызуе мэты, задачы і прынцыпы забеспячэння нацыянальнай бяспекі ў інфармацыйнай сферы, асноўныя кірункі нейтралізацыі ўнутраных крыніц пагроз і абароны ад знешніх пагроз нацыянальнай бяспецы ў гэтай сферы;

прадугледжвае рэалізацыю гэтых мэт, задач і прынцыпаў як неад'емную частку функцыянавання агульнай сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі.

7. Канцэпцыя таксама зыходзіць з геапалітычных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, яе месца і ролі ў сучасным свеце, грунтуецца на пагадненнях аб супрацоўніцтве ў галіне забеспячэння інфармацыйнай бяспекі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, дзяржаў — членаў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, двухбаковых пагадненнях і іншых абавязацельствах Рэспублікі Беларусь у галіне міжнароднай інфармацыйнай бяспекі, улічвае асноўныя палажэнні актаў міжнародных арганізацый, у тым ліку рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, рэкамендацыі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе.

8. Для мэт гэтай Канцэпцыі выкарыстоўваюцца наступныя паняцці і іх азначэнні:

уздзеянне на інфармацыю — дзеянне па змяненні формы падачы і (або) зместу інфармацыі;

дзяржаўная інфармацыйная сістэма — сукупнасць банкаў даных, інфармацыйных тэхналогій і комплексу (комплексаў) праграмна-тэхнічных сродкаў, якая фарміруецца або набываецца за кошт сродкаў рэспубліканскага або мясцовых бюджэтаў, дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, а таксама сродкаў дзяржаўных юрыдычных асоб;

дзяржаўны інфармацыйны рэсурс — арганізаваная сукупнасць дакументаваній інфармацыі, якая ўключае базы даных, іншыя сукупнасці ўзаемазвязанай інфармацыі ў інфармацыйных сістэмах, якая фарміруецца або набываецца за кошт сродкаў рэспубліканскага або мясцовых бюджэтаў, дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, а таксама сродкаў дзяржаўных юрыдычных асоб;

дэструктыўнае інфармацыйнае ўздзеянне — ажыццяўленне інфармацыйнага ўплыву на палітычныя і сацыяльна-эканамічныя працэсы, дзейнасць дзяржаўных органаў, а таксама на фізічных і юрыдычных асоб у мэтах паслаблення абараназдольнасці дзяржавы, парушэння грамадскай бяспекі, прыняцця і заключэння загадзя нявыгадных рашэнняў і міжнародных дагавораў, пагаршэння адносін з іншымі дзяржавамі, стварэння сацыяльна-палітычнай напружанасці, фарміравання пагрозы ўзнікнення надзвычайных сітуацый, разбурэння традыцыйных духоўных і маральных каштоўнасцяў, стварэння перашкод для нармальнай дзейнасці дзяржаўных органаў, прычынення іншай шкоды нацыянальнай бяспецы;

абарона інфармацыі — комплекс прававых, арганізацыйных і тэхнічных мер, накіраваных на забеспячэнне канфідэнцыяльнасці, цэласнасці, сапраўднасці, даступнасці і захаванасці інфармацыі;

інфармацыйная бяспека — стан абароненасці збалансаваных інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы ад знешніх і ўнутраных пагроз у інфармацыйнай сферы;

інфармацыйная інфраструктура — сукупнасць тэхнічных сродкаў, сістэм і тэхналогій стварэння, пераўтварэння, перадачы, выкарыстання і захоўвання інфармацыі;

інфармацыйны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь — неад'емнае і выключнае вяршэнства права дзяржавы самастойна вызначаць правілы валодання, карыстання і распараджэння нацыянальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі, ажыццяўляць незалежную знешнюю і ўнутраную дзяржаўную інфармацыйную палітыку, фарміраваць нацыянальную інфармацыйную інфраструктуру, забяспечваць інфармацыйную бяспеку;

інфармацыйная сфера — сукупнасць інфармацыі, інфармацыйнай інфраструктуры, суб'ектаў, якія ажыццяўляюць збор, фарміраванне, распаўсюджванне і выкарыстанне інфармацыі, а таксама сістэмы рэгулявання грамадскіх адносін, якія ўзнікаюць пры гэтым;

інфармацыйная прастора — галіна дзейнасці, звязаная са стварэннем, пераўтварэннем, перадачай, выкарыстаннем, захоўваннем інфармацыі, якая аказвае ўздзеянне ў тым ліку на індывідуальную і грамадскую свядомасць і ўласна інфармацыю;

кібератака — мэтанакіраванае ўздзеянне праграмных і (або) праграмна-апаратных сродкаў на аб'екты інфармацыйнай інфраструктуры, сеткі электрасувязі, якія выкарыстоўваюцца для арганізацыі ўзаемадзеяння такіх аб'ектаў, з мэтай парушэння і (або) спынення іх функцыянавання і (або) стварэння пагрозы бяспекі інфармацыі, якая апрацоўваецца такімі аб'ектамі;

кібербяспека — стан абароненасці інфармацыйнай інфраструктуры і інфармацыі, якая змяшчаецца ў ёй, ад знешніх і ўнутраных пагроз;

кіберінцыдэнт — падзея, якая фактычна ці патэнцыяльна пагражае канфідэнцыяльнасці, цэласнасці, сапраўднасці, даступнасці і захаванасці інфармацыі, а таксама ўяўляе сабой парушэнне (пагрозу парушэння) палітык бяспекі;

кібертэрарызм — атакі на інфармацыйныя сістэмы, якія нясуць пагрозу здароўю і жыццю людзей, а таксама здольныя справакаваць сур'ёзныя парушэнні функцыянавання крытычна важных аб'ектаў у мэтах аказання ўздзеяння на прыняцце рашэнняў органамі ўлады, альбо перашкоды палітычнай ці іншай грамадскай дзейнасці, альбо застрашвання насельніцтва, альбо дэстабілізацыі грамадскага парадку;

кіберустойлівасць — здольнасць інфармацыйнай сістэмы прадбачыць змяненні абстаноўкі і своечасова адаптавацца да іх у мэтах паспяховага прадухілення негатыўных наступстваў або хуткага аднаўлення пасля кіберінцыдэнту;

міжнародная інфармацыйная бяспека — стан міжнародных адносін, які выключае парушэнне сусветнай стабільнасці і стварэнне пагрозы бяспецы дзяржаў і сусветнай супольнасці ў інфармацыйнай прасторы;

забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі — сістэма мер прававога, арганізацыйна-тэхнічнага і арганізацыйна-эканамічнага характару па выяўленні пагроз інфармацыйнай бяспецы, прадухіленні іх рэалізацыі, спыненні і ліквідацыі наступстваў рэалізацыі такіх пагроз;

злачынствы ў інфармацыйнай сферы — прадугледжаныя Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь злачынствы супраць інфармацыйнай бяспекі (кіберзлачынствы) і іншыя злачынствы, прадметам ці сродкам здзяйснення якіх з'яўляюцца інфармацыя, інфармацыйныя сістэмы і сеткі;

суверэнітэт даных — падпарадкаванасць адносін у сувязі з інфармацыяй у лічбавай форме, якія ўзнікаюць на тэрыторыі Беларусі, нацыянальнай юрысдыкцыі Рэспублікі Беларусь.

Іншыя тэрміны ў Канцэпцыі прыведзены ў значэннях, якія выкарыстоўваюцца ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь і міжнародных актах, удзельніцай якіх з'яўляецца Рэспубліка Беларусь.

РАЗДЗЕЛ ІІ
СТАН І РАЗВІЦЦЁ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ СФЕРЫ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

ГЛАВА 4
Гуманітарны аспект інфармацыйнай сферы

9. Асноватворным нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь у інфармацыйнай сферы з пункту гледжання гуманітарнага аспекту з'яўляецца рэалізацыя канстытуцыйных правоў грамадзян на атрыманне, захаванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі, свабоду думак, перакананняў і іх свабоднага выказвання, а таксама права на тайну асабістага жыцця.

10. У цяперашні час стан інфармацыйнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь характарызуецца высокім узроўнем доступу насельніцтва краіны да масавай інфармацыі. Колькасць нацыянальных сродкаў масавай інфармацыі (далей — СМІ) і інтэрнэт-рэсурсаў няўхільна павялічваецца, фарміруецца пры ўдзеле дзяржавы і ў недзяржаўным сектары. Беларуская інфармацыйная прастора адкрыта для актыўнай работы замежных СМІ і інтэрнэт-рэсурсаў. У краіне штогод павялічваюцца прапускная здольнасць знешніх каналаў доступу ў сетку Інтэрнэт, колькасць інтэрнэт-карыстальнікаў, абанентаў сетак электрасувязі. Таксама развіваецца інфармацыйнае ўзаемадзеянне грамадзян, стварацца сеткавыя супольнасці для камунікацыі, абмену інфармацыяй, досведам і ведамі, грамадскага абмеркавання праектаў нарматыўных прававых актаў, шырока прымяняецца практыка краўдфандынгу, павышаецца роля грамадскіх саветаў і незалежных экспертаў у прыняцці рашэнняў дзяржаўнымі органамі, фарміруюцца інстытуты грамадскага самакантролю ў мэтах захавання гістарычнай, культурнай спадчыны і ўмацавання правасвядомасці.

У цэлым беларускай інфармацыйнай прасторы ў поўнай меры ўласцівыя сусветныя трэнды інфарматызацыі, у тым ліку перавод СМІ ў лічбавы фармат (дыгіталізацыя), спалучэнне іх розных тыпаў (мультымедыйнасць), адаптацыя інфармацыйнага прадукту да распаўсюджвання праз Інтэрнэт, збліжэнне і зліццё ў ёй розных тыпаў СМІ (канвергенцыя).

